# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ Ў ПЕРЫЯД ПРАВЯДЗЕННЯ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ Ў БССР

**М. К. Альховік**

Як вядома, у цэлым у час уваходжання Беларусі ў склад СССР адбывалася палітыка, накіраваная на русіфікацыю Беларусі, выкараненне беларускай нацыянальнай ідэі ды на рэпрэсаванне яе носьбітаў [3, с.136]. Аднак з усяго гэтага перыяду выдзяляецца фенаменальная эпоха сутнасна новае палітыкі – палітыкі беларусізацыі, якая праводзілася ў Савецкай Беларусі ў 1920-я – пачатку 1930-х гг. пад кантролем і пры падтрымцы маскоўскіх уладаў [6, с.102].

Новая палітыка па нацыянальным пытанні была абвешчана кіраўніцтвам РКП(б) у 1921 г. і стасавалася да розных нацыянальных рэгіёнаў СССР [2, с.118–119]. На Беларусі гэта палітыка атрымала назву беларусізацыі, і канчаткова стала дзяржаўнаю палітыкай у 1924 г.

Гэтая палітыка меркавала развіццё беларускай мовы і пашырэнне ейных функцыяў, беларусізацыю партыйнага і дзяржаўнага апарата, працы грамадскіх арганізацыяў, сістэмы адукацыі і навучання, часцей Чырвонай Арміі на Беларусі, друку, культурнага жыцця, а таксама вылучэнне асобаў, знаёмых з беларускімі асаблівасцямі на службовыя пасады.

У гады беларусізацыі адбылося, здавалася б, немажлівае – аб’яднанне ўсіх беларускіх нацыянальных сілаў, нягледзячы на іхную ідэалогію, на стаўленне да Савецкае ўлады і бальшавіцкага рэжыму, вакол падтрымкі дадзенай палітыкі, распачатай усесаюзным партыйным кіраўніцтвам. Бо тая палітыка была сугучная з іхнымі поглядамі на будаўніцтва беларускай па змесце краіны.

Беларусізацыя была шырокамаштабнаю палітыкай нацыянальнага адраджэння і будаўніцтва. Кіраўніцтва КПСС вызначала межы для яе наступным чынам: мусіць быць культура нацыянальная паводле формы, «пралетарская» паводле зместу. Беларускія нацыянальныя дзеячы, у т.л. «нацыянал-камуністы» маўкліва пагадзіліся з гэтаю сталінскаю формулай, аднак на практыцы ёй не кіраваліся.

Што да ідэалогіі палітыкі беларусізацыі, то тут важна разумець наступныя фактары.

Па-першае, яна найперш зыходзіла з боку «нацыянал-камуністаў», а іншыя беларускія нацыянальныя дзеячы таксама ў той ці іншай ступені не маглі не ігнараваць фактару уваходжання Беларусі ў склад СССР і існавання Савецкай улады [4, с. 12–14].

Па-другое, у канцы XIX – першай трэці XX ст. беларускі

нацыянальна-адраджэнскі рух аказаўся ў значнай ступені злучаным з сацыялістычнымі, левымі ідэямі. Злучэнне ідэяў нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення беларускага народа знайшло шырокую падтрымку ў працоўных масаў Беларусі. Найбольш гэтае злучэнне мы знаходзім у ідэалогіі нацыянальна скіраваных бальшавікоў.

Аб'яднанне нацыянальнай ідэі і левай ідэалогіі паслужыла падвойную ролю. З аднаго боку, левыя погляды прыцягвалі ў шырокія масы народа беларускую свядомасць, легалізавалі яе і пашыралі. З іншага боку, нацыянальная ідэя станавілася закладнікам далейшай перспектывы крайне левых поглядаў, з якіх складалася бальшавіцкая ідэалогія.

Цэнтральным момантам у палітыцы беларусізацыі, яе фундаментам была адзначаная беларуская мова. Яна была галоўнаю дзяржаўнаю мовай БССР у гэты час. Дзяржаўныя і партыйныя органы, грамадскія арганізацыі праяўлялі клопаты аб яе развіцці, аказваючы сярод іншага і ідэалагічную падтрымку, накіраваную на ліквідацыю моўных забабонаў насельніцтва. На беларускай мове стала прэстыжна размаўляць, чытаць і пісаць.

Беларусізацыя дзяржаўных установаў і грамадскіх арганізацыяў, камплектаванне партыйных і дзяржаўных органаў, часткова вайсковых часцей выхадцамі з Беларусі (палітыка каранізацыі) канструявала беларускую дзяржаву паводле зместу і бальшавіцкую паводле формы, а не наадварот. БССР станавілася цэнтрам прыцягнення ўсіх нацыянальна-адраджэнскіх сілаў, успрымалася як беларуская дзяржава, а беларусізацыя ўспрымалася як дзяржаўная ідэалогія гэтай краіны. У Савецкую Беларусь прыязджаюць прадстаўнікі беларускай эміграцыі з мэтай працы на карысць справы беларусізацыі і адраджэння.

Палітыка беларусізацыі была накіраваная на ліквідацыю нацыянальнай несвядомасці беларусаў адносна іхнай мінуўшчыны. Грамадства ў гэты перыяд літаральна захварэла на мінулае. Паўсюдна ствараюцца краязнаўчыя гурткі. Навуковымі ўстановамі і суполкамі разгортваюцца беларусазнаўчыя даследаванні. У гэты час шпаркімі тэмпамі развіваецца нацыянальная літаратура і тэатр. Ствараюцца літаратурныя і пісьменніцкія гурткі. Разгортваюцца творчыя дыскусіі, якія набываюць не толькі нацыянальную, але й палітычную афарбоўку.

Кастрычніцкая рэвалюцыя разглядаецца як этап барацьбы за сацыяльнае вызваленне народа. Ствараецца пантэон нацыянальных герояў (Скарына, Багушэвіч і іншыя) і памятных падзеяў (напрыклад, У.Ігнатоўскі шмат прыклаў намаганняў па гераізацыі паўстання К.Каліноўскага). На высокім дзяржаўным узроўні было адзначанае 400-годдзе беларускага друку (1925), праведзеная навуковая канферэнцыя па беларускім правапісе (1926). У час канферэнцыі зала была ўпрыгожана

беларускаю нацыянальнаю сімволікай, пры адкрыцці канферэнцыі не было дзяржаўнага сцяга СССР і партрэта У.Леніна. Усе выступоўцы падкрэслівалі значныя поспехі адраджэнскіх працэсаў.

У гэты час адбываецца выхаванне кадраў беларускай інтэлігенцыі – носьбіта нацыянальнай ідэі і ажыццяўляльніка палітыкі беларусізацыі. Беларусізацыя здолела выхаваць цэлае пакаленне патрыётаў, носьбітаў нацыянальнай ідэі. Іншыя пакаленні ўжо пачуваліся беларусамі і не сарамаціліся свае мовы. На беларускай мове гаварылі партыйныя і дзяржаўныя дзеячы – гэта значыць, была сфармаваная прыхільная да беларушчыны кіраўнічая эліта. Беларуская нацыянальная ідэя адлюстроўвалася ў літаратуры і перыядычных выданнях.

Аднак росквіт беларускай нацыянальнай ідэі раствараў касмапалітызм (ідэалогію кіраўніцтва) і ішоў у супярэчнасць з працэсамі будаўніцтва таталітарнай дзяржавы. Таталітарнай дзяржаве ўласцівая ўсеабдымная ўніфікаваная ідэалогія, якая не церпіць аніякай спецыфікі ні на якіх дзялянках дзяржаўнага і грамадскага жыцця. У нацыянальна-культурнай сферы адзіным фундаментам для гэтай ідэалогіі магла стаць руская мова і яе гвалтоўнае распаўсюджванне (русіфікацыя). Таму былі ажыццёўленыя наступныя акцыі ў 1929–1941 гг.:

1. знішчэнне большай часткі беларускай інтэлігенцыі як галоўнага генератара нацыянальнай ідэі, запалохванне рэшты, якая выжыла;
2. спыненне і фармалізацыя беларусізацыйных мерапрыемстваў (к 1933 г.), а потым паступовы паварот да русіфікацыі ўсіх сфераў жыцця (ідэалагічная платформа тут была сфармуляваная ўжо зусім іншая – зліццё нацыяў, растварэнне іхных прыкметаў);
3. фізічнае знішчэнне носьбітаў беларускай савецкай дзяржаўнасці – дзяржаўнай (палітычнай і эканамічнай) эліты беларускага народа;
4. калектывізацыя вынішчала сялянства, што ўжо паспела ў некаторай ступені ўсведаміць сваю аўтэнтычнасць.

Галоўнае, што было зробленае таталітарным рэжымам – дыскрэдытацыя беларускай нацыянальнай ідэі, названай нацыянал-дэмакратызмам і прыраўнанай да нацыянал-шавінізму і нацыянал-фашызму [5, с. 306]. Любыя клопаты па захаванні і развіцці нацыянальных адметнасцяў цяпер у бальшыні выпадкаў успрымаліся як варожыя, а таму падлягалі выкараненню [1]. Праўда пра развіццё беларускай нацыянальнай ідэі ў перыяд беларусізацыі змоўчвалася да сярэдзіны 1980-х гг.

**Літаратура**

1. Звязда. 1933, 8 снежня
2. *Кароль А.* Беларусізацыя – палітыка нацыянальнага адраджэння // Крыжовы шлях.

Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. Мн., 1993
3. *Касцюк М.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. М., «Экаперспектыва», 2000, 308 с.
4. НАРБ, фонд 4П, вопіс 1, справа 4757
5. НАРБ, фонд 4П, вопіс 1, справа 6352
6. Платонаў Р.П. Беларусь у міжваенны перыяд. Старонкі палітычнай гісторыі ў святле архіўных крыніц. Мн.: БелНДІДАС, 2001, 282 с.

# ОБ ОСНОВОПОЛОЖЕНИЯХ ТРАНСЦЕНДЕНТАЛЬНОГО МЕТОДА КАНТА

**И. В. Байдаков**

## 1. ОБЩЕТЕОРЕТИЧЕСКАЯ ЧАСТЬ

1. Условимся понимать под *основоположениями* философского метода или философской системы как его конечного результата те непосредственные логические предпосылки, которые имеют форму логического суждения, и неприятие которых влечёт отрицание всей этой системы.

2. Основоположения философской системы с необходимостью должны быть синтетическими суждениями. В противном случае они не могут быть положены при образовании системы.

3. Философ не всегда непосредственно осознаёт эти основоположения, поэтому для их обнаружения должна применяться *рефлексия*.

## 2. ПОДХОД К ОСНОВОПОЛОЖЕНИЯМ «КРИТИКИ ЧИСТОГО РАЗУМА» КАНТА.

1. Кант в «Критике чистого разума» не приводит основоположений своей системы в эксплицитном, логически безупречном виде.

2. Искомые основоположения его трансцендентального метода не следует смешивать с теми основоположениями, которые он приводит в главе второй аналитики основоположений под названием «Система всех основоположений чистого рассудка», в которой Кантом производится анализ предпосылок *опыта* вообще и исследуется вопрос условий его возможности, т. е. даётся ответ на вопрос «как возможно естествознание»?

3. Поэтому обратимся ко второму предисловию «Критики чистого разума»: «До сих пор считали, что всякие наши знания должны сообразовываться с предметами. ... Поэтому, следовало бы попытаться выяснить, не разрешим ли мы задачи метафизики более успешно, если будем исходить из предположения, что предметы должны сообразовываться с нашим познанием, – а это лучше согласуется с требованием возможности априорного знания о них, которое должно установить нечто о предметах раньше, чем они нам даны» [1, с. 23].